**УДК [94(476)+355.23(476)(091)]«18»** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-66-1-55-64**

# ПАДРЫХТОЎЧЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДА АДКРЫЦЦЯ ПОЛАЦКАГА КАДЭЦКАГА КОРПУСА: АРГАНІЗАЦЫЙНА-ФІНАНСАВЫЯ АСПЕКТЫ

***канд. гіст. навук, дац. А.У. ЕРАШЭВІЧ***
***(Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6555-5176***

*Артыкул закранае арганізацыйна-фінансавыя аспекты, звязаныя з сукупнасцю падрыхтоўчых мерапрыемстваў расійскіх улад па стварэнні Полацкага кадэцкага корпуса ў 1830–1835 гг. Высвятляюцца прычыны стварэння сеткі губернскіх кадэцкіх карпусоў у імператарскай Расіі, перадумовы адкрыцця кадэцкага корпуса ў Полацку – сярэдняй ваенна-навучальнай установы закрытага тыпу ў павятовым цэнтры Віцебскай губерні. Раскрываецца працэс стварэння будаўнічай камісіі, яе персанальны склад, фінансаванне. Надаецца ўвага пошуку і выбару будынкаў для размяшчэння Полацкага кадэцкага корпуса, падрыхтоўчым мерапрыемствам па ўладкаванні кадэцкіх будынкаў. Вызначаюцца колькасныя паказчыкі асігнаванняў грашовых сродкаў на перабудову паезуцкіх будынкаў. Характарызуецца стан перабудаваных кадэцкіх будынкаў і іншыя дадатковыя работы па прыстасаванні культавага будынка да 1839 г. Прыводзяцца даныя аб грашовых разліках з падрадчыкамі і інфармацыя аб узнагароджванні членаў Камісіі. Паказваецца механізм збору фінансавых сродкаў для заснавання кадэцкага корпуса ў Полацку, выяўляюцца іх колькасныя вынікі да 1839 г. Большасць звестак, выцягнутых аўтарам з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і прыведзеных у артыкуле, выкарыстоўваецца ўпершыню ў нацыянальнай гістарыяграфіі.*

***Ключавыя словы:*** *Полацк, кадэцкія карпусы, падрыхтоўка, мерапрыемствы, будаўніцтва, грашовыя фонды, фінансаванне.*

**Уводзіны.** З гісторыяй Полацкага кадэцкага корпуса звязаны шэраг публікацый рознай навуковай вартасці. У пачатку XX ст. афіцэр Полацкага кадэцкага корпуса, падпалкоўнік Васіль Паўлавіч Вікенцьеў на аснове прагляду і апрацоўкі больш 60 тыс. афіцыйных дакументаў склаў дакументальную хроніку гэтай сярэдняй ваенна-навучальнай установы закрытага тыпу [1]. Дагэтуль даследаванне В.П. Вікенцьева па гісторыі Полацкага кадэцкага корпуса з'яўляецца найбольш факталагічна змястоўным і каштоўным з прычыны выкарыстання афіцэрам шматлікіх дакументаў з архіва гэтай ваенна-навучальнай установы, якіх захавалася няшмат, асабліва па перыяду да 60-х гг. XIX ст. Аднак аўтар у гістарычным нарысе засяродзіў асноўную ўвагу на асвятленні знакавых этапаў дзейнасці Полацкага кадэцкага корпуса ў кантэксце вывучэння працы яго кіраўнікоў-дырэктараў і фрагментарна, недастаткова даследаваў намаганні расійскіх улад адносна планаў і падрыхтоўчых мерапрыемстваў да адкрыцця гэтай ваенна-навучальнай установы. На матэрыялах яго аўтарытэтнай кнігі будаваліся таксама і папулярна-навуковыя творы, прысвечаныя Полацкаму кадэцкаму корпусу [2, с. 455–461]. У цэлым, больш разгледжаны педагагічныя, сацыяльныя, культурныя аспекты развіцця Полацкага кадэцкага корпуса, у адрозненне ад арганізацыйна-фінансавых і грамадска-палітычных.

Такім чынам, падрыхтоўчы працэс арганізацыі Полацкага кадэцкага корпуса пакуль не атрымаў належнага вывучэння ў беларускай гістарыяграфіі. Таму аўтар паставіў мэтай раскрыць сутнасць папярэдніх, падрыхтоўчых мер царскіх улад да адкрыцця Полацкага кадэцкага корпуса праз вызначэнне асноў фінансавага механізма яго фарміравання.

Артыкул, у асноўным, заснаваны на вывучэнні шматлікіх і разнастайных неапублікаваных дакументаў з 7 фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) у Мінску. Важныя звесткі наконт заяўленых аўтарам аспектаў праблемы ўтрымліваюцца ў матэрыялах афіцыйнай перапіскі ўрадавых устаноў і вышэйшых службовых асоб (віцебскага генерал-губернатара і грамадзянскага губернатара). Акрамя таго, выкарыстаны і прааналізаваны лічбавыя даныя ведамасцей і каштарысаў грашовых сум, якія паступалі ў распараджэнне будаўнічай камісіі ці захоўваліся ў мясцовым прыказе грамадскай апекі.

**Асноўная частка.** Тэмпы росту асабовага складу ўзброеных сіл Расійскай імперыі не супадалі са ступенню забеспячэння іх унтэр-афіцэрамі і афіцэрамі. Праблема кадравага «голаду» вымагала неабходнасць стварэння цэнтраў падрыхтоўкі ваенных кадраў для ўкамплектавання афіцэрскім складам расійскіх палявых войскаў. У грамадстве распаўсюджваліся дэмакратычныя ідэі, і менавіта ў афіцэрскіх колах узнікалі тайныя арганізацыі, якія пагражалі непахіснасці манархічнага ладу дзяржавы, як гэта паказалі падзеі дзекабрысцкага руху. Новы імператар Мікалай I прытрымліваўся ідэалу ваеннай арганізацыі дзяржавы, якая будавалася па мадэлі «вайсковай казармы». Галоўныя атрыбуты ваеннай арганізацыі (уніфікацыя і рэгламентацыя жыцця, субардынацыя, унутраная дысцыпліна і парадак, калектывізм) выкарыстоўваліся для сцірання індывідуальнасці, ліберальных памкненняў, выкаранення непаслухмянасці, ганарлівасці. Імператар Мікалай I вырашыў стварыць сетку ваенна-навучальных устаноў у якасці часткі агульнай галіны дзяржаўнага кіравання для накіравання да адзінай мэты, якая заключалася ў выхаванні ў юнакоў, якія ў асноўным паходзілі з дваранскага асяроддзя, пачуццяў паслухмянасці і павагі да начальства ў духе вернападданай адданасці манархічнаму прастолу і свяшчэннай асобе імператара, лаяльнасці і прыхільнасці да Расіі. Гэтыя задачы прызначэння вайсковай службы для выхавання «адданых слуг Айчыны» магчыма было, на думку ўрада, рэалізаваць у закрытых ваенна-навучальных установах, у якіх найблізкае асяроддзе юнакоў (бацькі, блізкія, знаёмыя, сябры) не маглі істотным чынам паўплываць на фарміраванне якасцей і пачуццяў будучага абаронцы інтарэсаў расійскай дзяржавы.

З мэтай забеспячэння магчымасці ваеннага навучання малалетніх дваран розных губерняў паблізу месцаў пражывання іх сямей імператар Мікалай I 1.02.1830 г. зацвердзіў прапанову аб заснаванні губернскіх кадэцкіх карпусоў у Ноўгарадзе, Туле, Тамбове, Палтаве, Елісаветградзе і Полацку з вызначанай нормай прыёму ў ніх па 400 кадэтаў у кожны [3, арк. 65]. Колькасць прызначаных для набору дваранскіх вакансій залежала ад ступені ўдзелу суседніх з месцам адкрыцця кадэцкіх карпусоў губерняў у справе назапашвання патрэбных для іх арганізацыі грашовых сродкаў. Агульны нагляд за зборам капіталаў, мяркуемых да стварэння кадэцкіх карпусоў, а таксама і першапачатковыя меры па ўладкаванні для іх патрэбных будынкаў, быў ускладзены на Галоўны штаб Яго Імператарскай Вялікасці па ваеннаму пасяленню.

На тэрыторыі беларускіх губерняў Расійскай імперыі сярэдняя ваенна-навучальная ўстанова закрытага тыпу з’явілася ў павятовым горадзе Віцебскай губерні і была адкрыта, у адрозненне ад іншых кадэцкіх карпусоў, па-за межамі губернскага цэнтра. Выбар горада Полацка ў якасці месца размяшчэння будучага кадэцкага корпуса дыктаваўся наступнымі абставінамі: 1) фінансавымі матывамі: наяўнасць паезуіцкіх будынкаў (вялікага будынка былога езуіцкага манастыра, езуіцкай акадэміі і піярскага вышэйшага вучылішча з 10 навакольнымі прылеглымі да яго будынкамі), а таксама 6 мураваных казённых дамоў дазваляла, з улікам іх перабудовы, прыстасаваць іх пад вучэбныя і жыллёвыя памяшканні; паезуіцкі манастыр мог паслужыць інтэрнатам для размяшчэння малалетніх дваранскіх хлопцаў, а ўсе паезуіцкія пабудовы давалі магчымасць сэканоміць дзяржаве фінансавыя сродкі, якія былі неабходныя для пабудовы новых будынкаў для адкрываемай сярэдняй ваенна-навучальнай установы); 2) геаграфічным фактарам: даволі ўдалае знаходжанне гэтага павятовага горада са значнай колькасцю насельніцтва (па стане на 1833 г. сярод 42 афіцыйных беларускіх гарадоў Полацк займаў другое месца па колькасці насельніцтва сярод усіх павятовых гарадоў пасля Брэста, саступаючы толькі губернскім цэнтрам Магілёву, Віцебску, Мінску, але апярэджваючы Гродна) і разгалінаваная інфраструктура пасярод прыпісаных да кадэцкага корпуса губерняў давалі, у адрозненне ад губернскага цэнтра, менш магчымасцей і спакусаў для задавальнення раскошнага стылю жыцця юнакоў; да того ж, мясцовых радавітых дваран і шляхту прываблівала магчымасць навучання іх хлопчыкаў-дзяцей непадалёк ад родных мясцін, а ўрады былі зацікаўлены ў забеспячэнні кадэт больш таннымі харчовымі прадуктамі, цэны на якія ў Віцебску былі вышэй, чым у Полацку); 3) ідэалагічнымі меркаваннямі: горад знаходзіўся ўдалечыні ад дзяржаўнай мяжы з Царствам Польскім як цэнтра польскага антыўрадавага нацыянальна-вызваленчага руху і раёнаў распаўсюджвання рымска-каталіцкай «польскай» веры, выступаў старажытным ачагом праваслаўя, у якасці аднаго з моцных асяродкаў дзяржаўна-палітычнага і духоўна-культурнага аб’яднання ўсходніх славян.

У адпаведнасці з палажэннем ад 26.04.1830 г., зацверджанага імператарам Мікалаем I, для перабудовы і ўладкавання збудаванняў былой езуіцкай акадэміі і манастыра, іх прыстасавання для размяшчэння Полацкага кадэцкага корпуса была створана асобная будаўнічая камісія пад назвай «Камісія аб уладкаванні Полацкага кадэцкага корпуса» пад старшынствам віцебскага генерал-губернатара М.М. Хаванскага (з восені 1836 г. яе ўзначальваў яго наступнік П.М. Дзякаў, пазней – адзін з удзельнікаў штурма Полацка 7.10.1812 г., першы дырэктар Полацкага кадэцкага корпуса генерал-маёр П.К. Хвашчынскі). У склад Камісіі ўвайшлі атрадны камандзір ваеннага пасялення 1-й і 2-й сапёрных брыгад Віцебскай губерні генерал-маёр Паўла Фёдаравіч Данілаў, начальнік работ акругоў ваеннага пасялення 1-й і 2-й сапёрных брыгад палкоўнік артылерыі Дзмітрый Пятровіч Данілаў, віцебскі грамадзянскі губернатар Мікалай Міхайлавіч Гамалея (пазней – Мікалай Іванавіч Шрёдэр), віцебскі губернскі маршал Марцін Францавіч Карніцкі (у далейшым – выконваючы абавязкі віцебскага губернскага прадвадзіцеля дваранства, віцебскі павятовы прадвадзіцель дваранства, маёр Мікалай Восіпавіч Енько, віцебскі губернскі прадвадзіцель дваранства Ігнаці Восіпавіч Шадурскі), віцебскі віцэ-губернатар, князь Сяргей Іванавіч Давыдаў (потым – Ніктапалеон Міхайлавіч Клеменцьеў, Марцін Восіпавіч Дамброўскі), полацкі павятовы маршал Тадэвуш Юсцініянавіч Шчыт (заменены Людвігам Іванавічам Беліковічам), духоўны дэпутат, настаяцель Полацкага Богаяўленскага манастыра, архімандрыт Палесій [4, арк. 53, 82; 5, арк. 69; 6, арк. 1; 7, арк. 34–34адв.; 1, с. 36, 37].

18.07.1830 г. адбылося першае пасяджэнне Камісіі (пад гэтай датай пазначана прапанова адкрыцця яе агульнай прысутнасці) [8, арк. 21], у ходзе якога быў заслуханы сенацкі ўказ ад 19.06.1830 г. з дадаткам аб уладкаванні будынкаў для размяшчэння ў іх Полацкага кадэцкага корпуса. Камісія выбрала памочніка архітэктара, мастака архітэктуры 14-га класа пры Герольдыі, Якава Максімава, якому было даручана скласці каштарысы будаўнічых работ і вызначыць тэрмін для канчатковага ўладкавання будынкаў. Камісія ўсклала абавязак нагляду за прыёмам, захоўваннем будаўнічых матэрыялаў і ажыццяўленнем работ на П.Ф. і Дз.П. Данілавых, Т.Ю. Шчыта, пастанавіла накіраваць у Полацк з Дынабургскай крэпасці каманду ў складзе 30 ніжніх чыноў ваенна-рабочага ведамства і 2 обер-афіцэраў для нагляду за захоўваннем будаўнічых матэрыялаў, вырашыла запрасіць падрадчыкаў з уласнымі матэрыяламі для будаўнічых работ. 17.08.1830 г. імператар Мікалай I аддаў загад Галоўнаму штабу я.і.в. па ваеннаму пасяленню аб прызначэнні палкоўніка Дз.П. Данілава кіраўніком работ па перабудове будынкаў для кадэцкага корпуса, аднак забараніў здаваць будаўнічыя работы ў выкананне падрадчыкам. Для вядзення бягучага справаводства ў Камісію быў прызначаны пісьмаводца Пётр Буланаў, была зацверджана сума канцылярскіх выдаткаў памерам у 800 руб. штогод. Архітэктарам Камісіі стаў надворны саветнік Антоні Порто (Порта), а казначэем быў абраны полацкі павятовы казначэй 8-га класа Сямён Лукашэвіч [9, арк. 4; 1, с. 37–38]. У канцы кастрычніка 1830 г. у распараджэнне Камісіі прыбылі падпаручнік Донат, прапаршчык Іваноў, 2 унтэрафіцэры і 28 радавых [10, арк. 43 адв.–46адв.; 1, с. 42–43].

Разам у Полацкай будаўнічай камісіі напрыканцы яе дзейнасці лічылася 11 чыноў, у тым ліку 4 грамадзянскія чыноўнікі (пісьмаводца, надворны саветнік П. Буланаў, казначэй 7-га класа С. Лукашэвіч са штогадовым жалаваннем кожнаму памерам у 1200 руб., архітэктар А. Порто з утрыманнем у 5000 руб. штогод (памёр 17.04.1836 г.),

памочнік архітэктара, губернскі сакратар Я. Максімаў, з заробкам у 2500 руб. штогод), 2 пісары (калежскі рэгістратар Вакар і канцылярыст Багамолец з вылучэннем кожнаму на ўтрыманне па 300 руб. штогод), 3 інжынерных афіцэра (палявы інжынер, штабс-капітан Кліменка, паручнік інжынернага корпуса ваенна-рабочай роты № 13 Донат, цейхвартэр 9-га класа запаснога парка 18-й палявой артылерыйскай брыгады Шыхаў, ім жалаванне выдаткоўвалася па ведамстве і чыну), 2 інжынераў з кандуктараў (старшы кандуктар 7-га ваенна-рабочага батальёна № 4 роты Фёдар Дземьянаў і Марка Перакростаў з жалаваннем кожнаму па 90,08 руб. штогод) [11, арк. 21, 53, 54]. Жалаванне архітэктару, яго памочніку, казначэю і пісарам выдзялялася з сумы, асігнаванай на ўладкаванне Полацкага кадэцкага корпуса [7, арк. 35].

Паводле палажэння ад 26.04.1830 г. аб уладкаванні будынкаў для размяшчэння Полацкага кадэцкага корпуса, на ўтрыманне будаўнічай камісіі было прызначана адпускаць з дзяржаўнага казначэйства 11 300 руб. асігнацыямі штогод, у тым ліку на жалаванне архітэктару А. Порто, яго памочніку Я. Максімаву, казначэю С. Лукашэвічу і 2 пісарам (губернскаму рэгістратару Мачале і двараніну Платону Краснаскулаву) – 9300 руб., пісьмаводцы П. Буланаву – 1200 руб., на канцылярскія расходы – 800 руб. За вераснёўскую трэць 1830 г. (з 1.09.1830 па 1.01.1831 г.), пасля выліку з утрымання чыноўнікаў па 2 кап. (2%) і з пісараў па 1 кап. (1%) з кожнага рубля ў пенсійны капітал, з Віцебскай казённай палаты да выдачы паступіла сума ў 3698,66 руб. асігнацыямі [12, арк. 10, 15–16; 5, арк. 189; 6, арк. 1адв.]. Прыход грошай дзеля ўтрымання Камісіі для пабудовы Полацкага кадэцкага корпуса склаў у 1830 г. суму ў 3698,66 руб., у тым ліку 2841,99 руб. прыбыла з Полацкага павятовага казначэйства ў лік асігнаваных Віцебскай казённай палатай з 1.09.1830 па 1.01.1831 г. на ўтрыманне архітэктара, яго памочніка і казначэя (12.11.1830 г. 1400 руб. асігнацыямі, а 17.12.1830 г. – астатнія 1441,99 руб.), а таксама 856,66 руб. з Віцебскага павятовага казначэйства на выдачу жалавання пісьмаводцы, 2 пісарам і на канцылярскія выдаткі па Камісіі. Выдатак 1830 г. адпавядаў прыходу [10, арк. 43адв.–46адв.]. У наступныя гады (1831–1836 г.) на ўтрыманне Камісіі аб уладкаванні будынкаў для Полацкага кадэцкага корпуса штогод адпускалася з дзяржаўнай казны па 11 300 руб. [13, арк. 99; 14, арк. 3, 112, 126; 10, арк. 53–58].

Галоўныя абавязкі Камісіі заключаліся ў выпрацоўцы папярэдніх распараджэнняў па ўладкаванні будынкаў, у нарыхтоўке будаўнічых матэрыялаў, пераўладкаванні будынкаў, вызначэнні парадку ажыццяўлення справаводства, форм справаздачнасці і іх накіроўванне ў Галоўны штаб яго імператарскай вялікасці па ваеннаму пасяленню [7, арк. 35–37 адв.].

Дзейнасць будаўнічай камісіі разгортвалася ў неспрыяльных умовах. Да горада Полацка ў 1831 г. набліжаліся паўстанцы з суседніх паветаў Віцебскай губерні, пракацілася хваля небяспечнай пандэміі халеры, у 1834 г. у Полацку і навокал горада разбойнічалі шайкі, якія нападалі нават на мірных жыхароў у павятовым цэнтры [11, арк. 41–41адв.].

Адным са складаных мерапрыемстваў па ўладкаванні кадэцкага корпуса ў Полацку быў пошук і выбар прыдатных для яго размяшчэння будынкаў. Паводле надрукаванага «Палажэння аб уладкаванні будынкаў для размяшчэння Полацкага кадэцкага корпуса» ад 26.04.1830 г. для пасялення плануемых у кадэцкім корпусе 400 чал. прызначаліся наступныя будынкі: паезуіцкі кляштар з належнымі яму пабудаванымі ў 1745 г. 10 сумежнымі паезуіцкімі будынкамі, а таксама 6 казённых дамоў. У памяшканнях паезуіцкага кляштара з належнымі яму будынкамі меркавалі размясціць кадэцкі корпус са службамі на 400 чал., кватэры для дырэктара корпуса і 4-х ротных камандзіраў, карпусную канцылярыю і кватэру для яе кіраўніка, а ў казённых дамах – кватэры для 13 жанатых і 14 халастых афіцэраў, чыноўнікаў, настаўнікаў. Тры трухлявыя казённыя дамы раздумвалі зламаць, каб пасля гэтага разбурэння выкарыстаць прыдатныя матэрыялы для выпраўлення іншых будынкаў кадэцкага корпуса [15, арк. 20; 7, арк. 33, арк. 33адв.–34]. Як вядома з журнальнай пастановы ад 23 і 30.09.1832 г. Камісіі, віцебскі мешчанін Янкель Файнштэін не выканаў умовы па заключаным кантракце адносна разборкі 3 мураваных будынкаў і па іншым работам [16, арк. 1, 2–2адв., 4–4адв.].

Такім чынам, першапачаткова кадэцкі корпус атрымліваў паезуіцкі кляштар з 10 прылеглымі да яго будынкамі і 6 казённых дамоў. Але ў далейшым для надання адзінства комплексу будынкаў кадэцкага корпуса было прызнана больш зручным зрабіць абмен будынкаў паміж Полацкім павятовым вучылішчам і мяркуемымі пабудовамі для гэтай сярэдняй ваенна-навучальнай установы. Палічылі больш мэтазгодным перадаць 3 дамы з вучылішчнага гарадскога ведамства для размяшчэння ў іх карпусных чыноўнікаў узамен прызначаемых у карпусное ведамства 2 дамоў, з вызначэннем каштарыснай рамонтнай сумы ў 64293,9175 руб. на кошт сумы, вылучанай для ўладкавання кадэцкага корпуса. Расійскі імператар 30.09.1831 г. загадаў уладкаванне 2 дамоў, перадаваемых з карпуснога ведамства замест 3 дамоў з вучылішнага, прадаставіць таму ведамству, у якое яны паступяць. Згодна з журналам будаўнічай камісіі ад 2.12.1830 г. адбыўся размен 3 вучылішных дамоў на 2 «кадэцкія» дамы. Іх выпраўленне павінна было праводзіцца на кошт асігнаванай на ўтрыманне кадэцкага корпуса сумы, бо перададзеныя яму будынкі ўжо былі адрамантаваны. Працу меркавалі пачаць не раней 1833 г. Але будаўнічая Камісія 24.04.1831 г. прыняла іншую пастанову, паколькі перадача дамоў з гарадскога ведамства патрабавала значных выпраўленняў на суму да 38 тыс. руб. Дамы Полацкага павятовага вучылішча былі канчаткова здадзены ў ведамства кадэцкага корпуса 17.03.1833 г. [15, арк. 5адв., 6адв.–8, 37–37адв.; 7, арк. 90–90адв., 183–184адв., 196]. Да таго ж, начальнік штаба па ваенным пасяленням 25.04.1832 г. даслаў генерал-губернатару ведамасць аб 11 дамах жыхароў Віцебскай губерні, якія былі ў закладзе за ўзятую імі казённую соль. Ён дапытваўся, ці магчыма нявыкупленыя гаспадарамі ў належны тэрмін дамы скарыстаць для патрэб кадэцкага корпуса Высветлілася, што гарадскія дамы знаходзіліся ў розных месцах, аддаленых ад карпусных будынкаў, у разладжаным стане, а іх выпраўленне патрабавала значных сум [15, арк. 39–39адв., 42].

Будаўнічая Камісія пачала працу 23.09.1830 г. [17, с. 78]. Для ўладкавання памяшканняў для Полацкага кадэцкага корпуса яна, згодна журнальнай пастановы ад 22.10.1830 г., выклікала на 1831 г. усіх жадаючых прыняць удзел у публічных таргах для заключэння кантрактаў наконт умоў і парадку ажыццяўлення будаўнічых работ і па пастаўке патрэбнай колькасці і асартыменту будаўнічых матэрыялаў. Аўкцыйныя таргі ў Полацку аб пастаўцы будаўнічых матэрыялаў і рабочых былі абвешчаны на 14-16.01.1831 г., паўторныя – на 16.03. (наём рабочых), а ператорг – на 20.03.1831 г. [18, арк. 1, 8, 16, 18, 19, 20, 24–24адв., 28, 32–32адв., 33, 39, 44, 45, 51]. Згодна з ведамасцю належных будаўнічых матэрыялаў на 1831 г., неабходных для перабудовы былога езуіцкага кляштара пад кадэцкі корпус, патрабавалася: 2640 сасновых і 3099 яловых бярвенняў, 2594 брускі, 19 835 дошак рознай даўжыні і таўшчыны, 24 060 штук драніцы даўжынёй у 3 аршыны, 662 625 жалезных цвікоў, больш 1037 пудоў і 12 603 штук ліставога жалеза, больш пуда сталі, 3128 штук выробленых жалезных рэчаў (для апрацоўкі дзвярэй, акон, замкоў, печаў), 290 чугунных рэчаў для печаў, іншыя розныя матэрыялы і прыпасы: 78 500 штук цэглы жалезнага выгляду і 990 350 штук чырвонага першых двух відаў, 117,75 сажняў$^3$ шэрай вапны, 4135 пудоў белай вапны, 11 650 штук кафлі з вуголлямі, 43 сажні$^3$ гліны, 196,25 сажняў$^3$ пяску, 1991 пуд алебастру, 167 пудоў складу з дзёгацю і смалы, 15 пудоў густой смалы, больш 17 пудоў дроту, 394 пуды канаплянага масла, 193 пуды плаўленага мелу, больш 68 пудоў “черляди”, 6 пудоў “сибирки”, 410 пудоў светлай і 41 пудоў цёмнай вохры, 152 пудоў англійскіх бяліл, 9 пудоў сажы, 6 пудоў “брауншвейн”, 9 пудоў сурыку, 9 пудоў “зальберглейту”, 2 пуды “умбры”, 18 пудоў сталярнага і 66 пудоў “мездринного” клею, 15 пудоў крахмалу, 1369 чвэрцяў рускага вуголля, 1660 сажняў смаляных вяровак у 2 дзюймы ў акружнасці, 114 каровіных лямцу, 4930 паўбелых штук шкла даўжынёй у 12 і 11 вяршкоў, 928 штук розных мураваных пліт, 52 сажні бутавага і 22 сажні$^3$ дробнага булыжнага каменю [падлічана: 18, арк. 2–3адв., 16адв.–16а адв.]. Кожны дзень на будаўнічых работах меркавалі задзейнічаць да 322 майстроў розных прафесій і да 100 рознарабочых (табліца 1).

Табліца 1. – Нормы патрэбы рабочых для ўладкавання будынкаў Полацкага кадэцкага корпуса на 1831 г.

| Званне майстроў | К-ць складаных дзён | Сярэдняя прапорцыя людзей на кожны дзень, чал. | Званне майстроў | К-ць складаных дзён | Сярэдняя прапорцыя людзей на кожны дзень, чал. |
|---|---|---|---|---|---|
| Муляры | 5681 | 65 | Слесары | 17 | 1 |
| Цесляры | 5762 | 45 | Кавалі | 795 | 15 |
| Сталяры | 2226 | 20 | Страхары | 2731 | 60 |
| Купоры (рамонт драўлянага посуду) | 20 | 1 | Шкляры | 202 | 10 |
| Тынкоўшчыкі | 2907 | 45 | Мастаўшчыкі (насцілка падлогі) | 118 | 10 |
| Печнікі | 1365 | 20 | Валавыя рабочыя | 13374 | 100 |
| Маляры | 2183 | 30 | Рабочыя коні з вупражжу і фурманамі | 600 | 10 |

*Крыніца:* [18, арк. 4–5адв., 16а адв.–17].

Шмат клопатаў і намаганняў уяўляла праблема ачысткі паезуіцкага будынка ад маёмасці размешчаных там раней піяраў (кніг бібліятэкі і кнігарні, фізічнага кабінета, мінералагічнай калекцыі і карцін галерэі, рэчаў астранамічнага зала, ракавін і іншых каштоўнасцей музея, а таксама прадметаў у памяшканнях і калідорах, друкарскага абсталявання, музыкальных інструментаў і нот, розных гаспадарчых рэчаў), паколькі рэктар піярскай вучэльні Каласанцій Барташэвіч не спяшаўся вывозіць рэчы і абсталяванне.

Пасля ўважлівага агляду паезуіцкага будынку архітэктар і яго памочнік склалі планы і каштарысы яго перабудовы шляхам злучэння ў адзіны агульны будынак трох самастойных трохпавярховых пабудоў (адгалінавання з тэатрам, крыла з музеем і кабінетамі, а таксама цэнтральнага будынка з келлямі) [1, с. 38]. У канцы 1830 г. архітэктар А. Порта склаў план, фасад і каштарыс для ўладкавання капліцы ў будынках корпуса для кадэтаў-каталікоў. Але яго план быў заменены чарцяжом губернскага архітэктара Беціні. Часткі галоўнага будынка перабудоўваліся паводле плана і фасада, зацверджанага імператарам 19.04.1830 г. [19, арк. 3–3адв.]. Апроч таго, пасля агляду памяшканняў будаўнічая камісія, у дадатак да афіцыйна зацверджаных імператарам планаў і каштарысаў, даручыла архітэктарам скласці разлікі на дадатковыя работы. У былым паезуіцкім манастыры задумвалі павялічыць памяшканні для кадэт шляхам знішчэння ці разбірання некаторых папярочных сцен, замяніць мураваныя столевыя скляпенні драўлянымі абтынкаванымі столямі ў вучэбных памяшканнях, уладкаваць зімовыя рамы ва ўсіх вучэбных і спальных памяшканнях, павялічыць таўшчыню месцаў пад вокнамі, залажыць непатрэбныя западзіны у пакоях. Акрамя таго, было неабходна злучыць у адну цэлую кампазіцыю 3 самастойныя паезуіцкія будынкі, фасады кожнага з якіх мелі самастойны архітэктурны малюнак, асобныя лесвіцы, паверхі і вокны якіх размяшчаліся на розных узроўнях, а ўсе пакоі, залі і калідоры аддзяляліся моцнымі капітальнымі сценамі. Да таго ж, было неабходна пабудаваць шмат новых будынкаў, у прыватнасці, просты дом для дырэктара (дом,势 планаемы для размяшчэння дырэктара, перадаваўся іншым чыноўнікам, а начальніку корпуса трэба было пабудаваць іншае больш прасторнае і зручнае памяшканне) і апроч яго меркавалі збудаваць 5 драўляных надворных гаспадарчых будынкаў для эканамічных патрэб і размяшчэння карпусных чыноўнікаў [1, с. 40, 41].

У цэлым, належала правесці перабудову і прыстасаванне шматлікіх будынкаў. Змены ў планіроцы, перабудове і ўладкаванні будынкаў пад кадэцкі корпус для пашырэння карысных плошчаў яго памяшканняў праходзілі на працягу 1831–1835 гг. З мэтай уладкавання прыдатных спальняў для кадэт у карпусах А і Г трэба было

ажыццявіць разборку большасці столевых скляпенняў і папярочных сцен келій 2-га і 3-га паверхаў, у корпусе В замяніць столі 2-га паверха і кроўлю, у памяшканнях прабіць і закласці дзверы, пераабсталяваць печы. Папярэдняя праверка зробленых будаўнічых работ была запланавана на май 1833 г., а асноўныя будаўнічыя работы меркавалі завяршыць у верасні 1834 г. [17, с. 75–78].

Восенню 1830 г. на перабудову паезуіцкіх будынкаў было асігнавана 527 569,03 руб. Акрамя таго, на дадатковыя работы архітэктары прадставілі каштарысы на 51 678,25 руб., таму агульная сума будаўнічых выдаткаў вызначалася ў 579 247,28 руб. Для папярэдняй нарыхтоўкі будаўнічых матэрыялаў на 1831 г. Камісія прасіла адпусціць 286 262,72 руб., ці суму, вылічаную па каштарысу на пабудовы ў 1831 г. [1, с. 41, 42]. Для перабудовы будынкаў Полацкага кадэцкага корпуса эканамічны камітэт начальніка штаба ваенных пасяленняў генерал-ад'ютанта П.А. Клейнміхеля накіраваў 5.02.1831 г. віцебскаму генерал-губернатару суму ў 250 000 руб. Асігнацыямі, якая паступала ў пазыку з капіталу ваенных пасяленняў. Гэтыя фінансавыя сродкі былі размеркаваны наступным чынам: 125 тыс. руб. паступілі 24.02.1831 г. Дз.П. Данілаву, 25 тыс. руб. былі пералічаны выконваючаму абавязкі віцебскага грамадзянскага губернатара М.М. Гамалею, 100 тыс. руб. прызначаліся для перадачы смаленскаму грамадзянскаму губернатару Хмяльніцкаму ў пазыку для нарыхтоўкі хлеба для замежнага харчавання Дзеючай арміі [20, арк. 1, 2, 3, 4; 21, арк. 1–2; 15, арк. 57адв.].

Былі заключаны кантракты з памешчыкам Суражскага павета Грынеўскім на пастаўку лясных матэрыялаў і каменю на 26 145,25 руб. (пры задатку ў 7935 руб.) і цвярскім купцом Іванам Назаравым на прывоз жалезных матэрыялаў на 44 791,44 руб. (пры задатку ў 6500 руб.) [20, арк. 5, 6, 9, 17, 18, 19; 21, арк. 5, 6, 8адв.]. Для працягу будаўнічых работ на 1832 г. было неабходна асігнаваць 120 782,31 руб. [22, арк. 16]. На 1833 г. Камісія запланавала будаўнічых работ на 198 596,71 руб., аднак паколькі ў яе ведамстве было 53 411,7 руб. (да 1833 г. наяўнай рэшткавай сумы 46 011,7 руб., выдана на пастаўку матэрыялаў па абавязацельствам з дзяржаўнай казной розным асобам 7400 руб.), таму Дэпартамент ваенных пасяленняў на 1833 г. паменшыў асігнаваную суму да 145 185 руб. асігнацыямі [5, арк. 22адв., 23–23 адв.]. Разам на работы ў 1833 г. Камісія прасіла 198 586,71 руб., хоць будаўнічы камітэт ацэньваў іх у 194 344,95 руб. (па першапачаткова зацверджаным каштарысам сума ў 159 387,94 руб.). Меркаванні наконт дадатковых каштарысаў адрозніваліся: Камісія намагалася атрымаць 39 198,76 руб., а згодна разліку будаўнічага камітэта выходзіла 34 957 руб. [5, арк. 27–29адв.]. Адным словам, для ўладкавання прызначанага для Полацкага кадэцкага корпуса езуіцкага кляштара з 10 навакольнымі будынкамі паводле зацверджаных каштарысаў было прызначана адлічыць 527 569,03 руб., аднак у далейшым гэтая сума была павялічана за кошт дадатковых каштарысаў.

Камісія пачала будаўнічыя работы 18.07.1830 г. і падзяліла іх на 3 гады (1831, 1832 і 1833 гг.). У верасні 1833 г., калі работы падыходзілі да канца, Камісія пачала рамонт Полацкага праваслаўнага сабора [23, арк. 73адв.–74]. У верасні 1834 г. перабудова галоўнага будынка Полацкага кадэцкага корпуса была скончана.

У выніку трохлетніх будаўнічых сезонаў пад кіраўніцтвам Камісіі былі не толькі выкананы ўсе мяркуемыя будаўнічыя работы ў пабудовах па звычайным і дадатковым каштарысам, але яшчэ і вернуты дзяржаўнай казне 38 765,45 руб., ці 7,1% з сумы ў 546 473,2 руб., неабходнай па каштарыснаму роспісу на ўсе работы [22, арк. 39]. Замест каштарысных 546 473,2 руб. перабудова будынкаў каштавала 507 707,75 руб. (у 1831 г. паступіла 250 тыс. руб., у 1832 г. – 116 087,79 руб., у 1833 г. – 140 020 руб., і было выручана ад продажу пашкоджаных матэрыялаў 1599,96 руб.) [1, с. 49]. Па нашых падліках, агульныя будаўнічыя выдаткі склалі 495 606,3175 руб. асігнацыямі (табліца 2).

Табліца 2. – Ведамасць руху будаўнічай сумы за 1831–1834 гг., прызначанай для ўладкавання будынкаў Полацкага кадэцкага корпуса

| Год | Прыход, руб. асігнацыямі | Расход, руб. асігнацыямі | | Разам выдаткаў, руб. асігнацыямі |
|---|---|---|---|---|
| | | На матэрыялы | На работы | |
| 1831 | 250624 | 158023,825 | 68656,5775 | 226680,4025 |
| 1832 | 118136,8575 | 59856,4225 | 39392,715 | 99249,1375 |
| 1833 | 100825,1625 | 79310,23 | 35937,06 | 115247,29 |
| 1834 | 45965,7575 | 24138,8125 | 30290,675 | 54429,4875 |
| Разам | 515548,7775 | 321329,29 | 174277,0275 | 495606,3175 |

*Крыніца:* [11, арк. 8–9].

Расход сум па асобных распараджэннях складаўся часткова з каштарысных, а ў пэўнай ступені – з непрадбачаных выдаткаў (19 942,46 руб.). Разам сума выдатку была вылічана ў 515 548,7775 руб., з якой засталося ў наяўнасці матэрыялаў на суму ў 10 039,3975 руб., якая лічылася выдаткам на 1835 г. для перабудовы дома на плошчы, дробнага рамонту і інш. Усяго паводле каштарыса на перабудову будынкаў кадэцкага корпуса патрабавалася 642 654,24 руб., з якіх 1/10 частка сумы (64 265,45 руб.) вылучалася на надзвычайныя патрэбы. З агульнай сумы ў 706 919,69 руб. было выдаткавана толькі 505 509,38 руб., засталося каштарысных 201 410,31 руб. і матэрыялаў на суму ў 10 039,3975 руб., было зроблена выключэнне за старыя прыдатныя матэрыялы на 12 766,5 руб., выручана за праданыя з публічнага торгу непрыгодныя матэрыялы 2113,05 руб. Разам з улікам выключэння расходаў у памеры 14 880,01 руб. засталося 186 530,29 руб. і да 1835 г. нарыхтаваных матэрыялаў на суму ў 10 039,3975 руб. [11, арк. 10–10адв.].

Пастаянныя члены Камісіі 28.08.1834 г. рапартавалі, што карпусныя будынкі былі скончаны [5, арк. 161]. Агляд перабудаваных будынкаў першым дырэктарам кадэцкага корпуса П.К. Хвашчынскім дазволіў яму прыйсці

да высновы, што яшчэ неабходна было палепшыць лазарэт (павялічыць яго да 40 ложкаў), калідоры, якія акружалі спальні і класы кадэт, зрабіць іх больш цёплымі за кошт двайных вокнаў і печаў, а цагляныя падлогі ў калідорах пакрыць масцікай і алейнай фарбай [14, арк. 80–80адв., 110–110адв.]. Прысутны пры адкрыцці 25.06.1835 г. Полацкага кадэцкага корпуса выконваючы абавязкі начальніка штаба Галоўнага начальніка Пажаскага і кадэцкіх карпусоў, палкоўнік Я.І. Растоўцаў, у дакладзе ад 3.07.1835 г. галоўнаму начальніку ваенна-навучальных устаноў, вялікаму князю Міхаілу Паўлавічу, звярнуў ўвагу на значныя недахопы: наяўнасць дрэннага лазарэта і на адсутнасць асобнага аддзялення для заразлівых хвароб. Маленькія пакоі, разлічаныя для размяшчэння па 2-3 кадэта ў кожным, былі настолькі невялікія і нізкія, што ў іх можна было паставіць не больш 20 ложкаў замест патрэбных па штату 40. Мелася толькі 30 кватэр для чыноўнікоў і настаўнікаў замест неабходнага іх ліку да 64. Калідоры былі высланыя цэглай, і таму ва ўсіх пакоях заўважалі чырвоны пыл. Акрамя штатлікіх непатрэбных калідораў, у ротах адсутнічалі цейхгаўзы і пакоі для чысткі абмундзіравання і амуніцыі, не хапала мэблі [24, с. 233–234; 1, с. 81–82]. Але ў цэлым Я.І. Растоўцаў адзначыў добры стан чыстага і пясторнага будынка кадэцкага корпуса, з адначасовымі шматлікімі важнымі і істотна шкоднымі недахопамі і дэфектамі [24, с. 239].

Акрамя каштарысных грашовых асігнаванняў, адлічаных для перабудовы будынкаў для патрэб Полацкага кадэцкага корпуса, вылучаліся асобныя сумы для рамонту асобнага дома на плошчы. У канцы 1834 г. імператар Мікалай I санкцыяніраваў перадачу з гарадскога ведамства Полацкаму кадэцкаму корпусу двухпавярховага мураванага дома на плошчы для размяшчэння ў ім чыноўнікаў корпуса, на рамонт якога выдаткоўвалася з дзяржаўнага казначэйства ў 1835 г. 30 000 руб. [14, арк. 4, 5, 25]. Ваенны міністр дазволіў у 1835 г. выкарыстаць з гэтай каштарыснай сумы на перасцілку бруку ў крузе карпусных будынкаў 2146,17 руб., на “ремонтные исправления” ў адбудаваных будынках корпуса – 4015 руб., на разбіўку падоўжнай сцяны ў доме па ненадзейнасці падмурка – 1295,9 руб., на іншыя патрэбы па доме і карпусных будынках – 6198,03 руб., разам на 13 655,1 руб (па нашых падліках) [14, арк. 35–35адв., 36, 37, 38, 110–110адв.]. Згодна каштарысу ад 30.01.1833 г. за подпісам памочніка архітэктара Я. Максімава на перабудову плошчы, размешчанай у горадзе каля 7 карпусных будынкаў, неабходнай для навучання кадэт ваеннай экзерцыцыі, патрабавалася 9133,97 руб. (6407,35 руб. платы рабочым за працу, а 2726,62 руб. – за будаўнічыя матэрыялы) [25, арк. 1–4].

У 1835 г. Міністэрства фінансаў загадала Віцебскай казённай палаце перадаць 1278 сажняў$^2$ зямлі з ліку паезуіцкіх пляцаў, якія знаходзіліся ў распараджэнні Дэпартамента дзяржаўнай маёмасці ў Верхнім замке для складкі дроў, у ведамства кадэцкага корпуса, пакуль яны яму былі неабходныя [26, арк. 1, 12, 15–15адв].

Складанай справай стаў пошук культавага будынка для мяркуемых выкладчыкаў і навучэнцаў Полацкага кадэцкага корпуса з ліку каталікоў. У маі 1834 г. будаўнічай камісіі было канчаткова даручана пераўладкаваць будынак былога паезуіцкага касцёла св. Стэфана ў праваслаўны Мікалаеўскі кафедральны сабор па праекце і планам архітэктара А. Порта з асігнаваннем на гэтую мэту з дзяржаўнай казны 153 528 руб., а для ўладкавання ў ёй 2 прыдзелаў (дадатковых алтароў) – 26 063,82 руб. [1, с. 49]. З Віцебскай казённай палаты ў 1835 г. было адлічана 20 000 руб. асігнацыямі, у тым ліку 2000 руб. серабром, прызначаных на перабудовы ў Полацкім праваслаўным саборы [14, арк. 119]. На працягу 1834 г. Полацкі кафедральны Мікалаеўскі сабор быў уладкаваны “в черне” з неабходнай апрацоўкай даху. Для ўладкавання Мікалаеўскага сабора патрабавалася не менш чым 109 017,7675 руб. [19, арк. 17, 17адв.]. Паводле імператарскага загада на перабудову і рамонт будынкаў кафедральнага сабора пры Полацкім кадэцкім корпусе ў 1835–1838 гг. у распараджэнне Дэпартамента ваенных пасяленняў паступіла разам 187 696,375 руб. асігнацыямі на кошт сум духоўнага ведамства (у 1838 г. толькі 2007 руб., а іншыя – 185 689,37 руб. у 1835–1837 гг.), якія аднак не выдаваліся, але адпускаліся часткамі па прадпісаннях Дэпартамента дзяржаўнага казначэйства з Віцебскага і Полацкага павятовых казначэйстваў. Разліковая выпіска аб прыходзе і расходзе грашовай суммы, выдаткаванай на ўладкаванне Полацкага Мікалаеўскага кафедральнага сабора ад 10.02.1839 г., сведчыць, што прыход будаўнічай сумы на 1838 г. склаў 2007 руб., з рэшткамі – 15361,44 руб., а выдатак 1838 і 1839 г. – 15 361,44 руб., акрамя кошту матэрыялаў і рэчаў. У 1838 г. па роспісу Сінода ў ведамства інжынернага начальства па Віцебскай губерні на перабудову і рамонт будынкаў кафедральнага сабора пры Полацкім кадэцкім корпусе паступіла 76 764 руб. асігнацыямі [10, арк. 3, 3адв., 4, 10–11, 19адв.–20, 32–35]. Пасля сканчэння перабудоў Мікалаеўскі кафедральны сабор паступіў у ведамства кадэцкага корпуса (у 1838 г. карпусная камісія прыняла сабор ад будаўнічай камісіі) і ў далейшым ўтрымліваўся за кошт яго сум [1, с. 116, 124].

Падрадчыкам было неабходна разлічыцца з майстрамі і рабочымі, прыбылымі для будаўнічых работ у Полацк з вялікарасійскіх губерняў [5, арк. 166]. Адпаведна ведамасці ад 19.10.1834 г. аб грашовай суме, належнай падрадчыкам, па канчатковаму разліку Камісіі ім належала заплаціць 11 290,69 руб., у тым ліку селяніну Касімаўскага павета Разанскай губерні Васілю Мельнікаву за работы цясляра, сталяра і тынкоўшчыка 7379,97 руб. (65,4%), мешчаніну Злынскага пасада Чарнігаўскай губерні Міхайле Сельскому за работы дахавую, малярную і шкляную – 1641,22 руб., полацкаму купецкаму сыну Даніле Чарнышову за дастаўку 156 пудоў 16 фунтаў поснага масла – 1251,2 руб., на розныя патрэбы да моманту перадачы карпусных будынкаў (на ўтрыманне гадзіннікавага майстра, камінара, прыслугі і на раз’езды) – 500 руб., за ачыстку прыбіральняў – 200 руб. па каштарысу, кавалю Александровічу за задзельныя рэчы – 149,04 руб., ніжнім чынам – 113 руб. узнагароды, полацкаму купцу 3-й гільдыі Вульфу Гінзбургу за пастаўку 2500 штук цэглы – 56,25 руб. У дадатак да наяўнай будаўнічай сумы памерам у 4140,69 руб. было неабходна дадаткова выплаціць 7150 руб., якія і былі адпушчаны з дзяржаўнага казначэйства ў канцы 1834 г. у распараджэнне Полацкай будаўнічай камісіі. З паступіўшых у ведамства Камісіі 11 300 руб. у 1835 г. 7150 руб. вылучаліся ў пазыку на кошт будаўнічай сумы [5, арк. 167, 190, 192; 14, арк. 8, 8адв.].

Пасля сканчэння асноўных работ па ўладкаванні будынкаў для Полацкага кадэцкага корпуса ў 1836 г. імператар Мікалай І распарадзіўся ўзнагародзіць грашыма чыноўнікаў Полацкай будаўнічай камісіі. Грошы адпраўляліся з Віцебскай казённай палаты. Архітэктар А. Порто і яго памочнік, губернскі сакратар Я. Максімаў, займелі па 2500 руб. асігнацыямі кожны, казначэй 7-га класа С. Лукашэвіч і пісьмаводца надворны саветнік П. Буланаў – па 1200 руб., паручнік ваенна-рабочай № 13 роты Донат – 700 руб., цейхвартэр 9-га класа запаснога парка 18-й палявой артылерыйскай брыгады Шыхаў – 480 руб., канцылярскі чыноўнік, калежскі рэгістратар Вакар і пісар камісіі, канцылярыст Багамолец – па 300 руб., старшы кандуктар ваенна-рабочага № 7 батальёна Перакростаў – 94 руб., разам 9274 руб. Акрамя таго, палкоўнік Дз.П. Данілаў атрымаў дадатковае жалаванне ў памеры 1000 руб. штогод да сканчэння службы, а інжынер штабс-капітан Кліменка набыў ордэн Св. Станіслава 4-й ступені (коштам у 50 руб.). З агульнай узнагароднай сумы ў 9274 руб. на карысць знявечаных вайскоўцаў вылучалася 918 руб., таму заставалася да выдачы 8356 руб. З Дэпартамента дзяржаўнага казначэйства обер-афіцэру і 7 класным чыноўнікам выплачвалася сума ў 9180 руб. (рэальна за вылікам 10% на карысць знявечаных заставалася да выдачы 8262 руб.) і 94 руб. кандуктару, разам 8356 руб. 20.06.1836 г. памянутыя ўзнагародныя сумы былі раздадзены і высланы па пошце [11, арк. 56–57адв., 60, 61–61адв., 64–66адв., 67–67адв.]. Апошні журнал пасяджэнняў Полацкай будаўнічай камісіі датуецца 19.07.1837 г., пасля якога яна здала рэштак сумы ў 830,36 руб. у Дэпартамент ваенных пасяленняў [1, с. 94].

Утварэнню Полацкага кадэцкага корпуса папярэднічала не толькі справа пошуку неабходных для яго размяшчэння будынкаў, але і працэс памнажэння грашовай касы. Ужо да 1829 г. для арганізацыі Полацкага кадэцкага корпуса дваранства суседніх губерняў ахвяравала 121 590,53 руб., у тым ліку з Мінскай губерні паступіла 100 620,5325 руб., з Віцебскай – 3664,995 руб., з Смаленскай – 17 305,0025 руб. Акрамя таго, у ведамства Полацкага кадэцкага корпуса была залічана сума памерам у 71 954,64 руб., якая вызначалася на ўтрыманне падпрапаршчыкаў (для 1-га пяхотнага корпуса 35 977,32 руб., 2-га пяхотнага корпуса – 35 977,32 руб.) [3, арк. 68, 85; 27, с. 108, 109]. Гэтае дзяржаўнае асігнаванне пад найменнем капіталу Полацкага кадэцкага корпуса было размешчана ў Захоўнай казне для прырашчэння працэнтаў, паколькі ўсе сабраныя грашовыя сумы для патрэб губернскіх кадэцкіх карпусоў загадвалася захоўваць у Захоўнай казне ці мясцовых прыказах грамадскай апекі для прыросту працэнтамі [1, с. 6; 27, с. 109].

У 1829 г. дваранства Віцебскай губерні абвясціла аб сваім намеры зрабіць ахвяраванні на патрэбы мяркуемага адкрыцця ў Полацку кадэцкага корпуса. 25.02.1829 г. віцебскі генерал-губернатар М.М. Хаванскі дазволіў павятовым маршалам Віцебскай губерні склікаць дваран сваіх паветаў у павятовыя гарады для агульнага абмеркавання парадку збору грашовых ахвяраванняў для кадэцкага корпуса [28, арк. 3]. Планавалі сабраць 1594,39 руб. аднаразовага збору (з Веліжскага павета 734,35 руб., Дынабургскага – 860,04 руб.), а таксама 8920,38 руб. штогоднай сумы (за 3 гады – 26 761,14 руб.). Разам на працягу 3-х гадоў меркавалася назапасіць 28 355,53 руб. З сумы 26 761,14 руб. на 6 беларускіх паветаў Віцебскай губерні прыпадала 15 117,24 руб. (56,5%) (з Віцебскага – 2917,44 руб., Полацкага – 3318 руб., Гарадоцкага – 860,7 руб., Суражскага – 2003,1 руб., Дрысенскага – 2815,05 руб., Лепельскага – 3202,95 руб.) [8, арк. 9]. Увогуле ў Віцебскай губерні на працягу 3-х гадоў праектавалі сабраць гэтую суму з сялянскіх рэвізскіх душ мужчынскага полу за кошт розных штогадавых падушных ставак ахвяраванняў: па 8 кап. у Віцебскім і Полацкім паветах, па 5 кап. – у Гарадоцкім, Дрысенскім, Лепельскім, Суражскім, Люцынскім, Рэжыцкім, Себежскім, Невельскім, Веліжскім, а ў Дынабургскім – аднаразова па 4 кап. Пры ўмове атрымання з дзяржаўнага казначэйства сумы да 170 000 руб. за дастаўленыя для расійскіх войскаў у 1812 і 1813 гг. харчовыя прадукты і фураж капітал мог быць яшчэ большым. Таксама намервалі выкарыстаць прыбыткі з паезуіцкіх уладанняў, а таксама даходы з маёнтка (205 душ) нябожчыка памешчыка Закрэўскага, якія былі завешчаны ім на выхаванне беднага высакароднага юнацтва. Маёнтак знаходзіўся ў апякунскім кіраванні (пры апекуне Міхале Закрэўскім даход маёнтка ў 1827 г. складаў толькі 893,97 руб., у 1828 г. – 798,61 руб. пры 14 853 руб. Прыватных даўгоў) [29, арк. 60адв.–61, 104, 105–105адв.].

На сходзе дваран Магілёўскай губерні 15.01.1830 г. спачатку было прынята рашэнне аб добраахвотным зборы на працягу 3-х гадоў на карысць Полацкага кадэцкага корпуса па 8 кап. з 65 699 рэвізскіх сялянскіх душ мужчын-уладальнікаў усіх паветаў, акрамя Чэрыкаўскага, разам 5255,92 руб. [30, арк. 38], якія павінны былі паступіць у Віцебскі прыказ грамадскай апекі для «прыросту працэнтамі» [31, арк. 2]. У дадатак, да 1830 г. 7 дваран Магілёўскай губерні ўнеслі 984 руб. аднаразовага збору [3, арк. 8]. Апроч таго, дваранства Магілёўскай губерні сабрала ў фонд Полацкага кадэцкага корпуса аднаразова ў 1829 г. 14,28 руб., у 1830 г. – 238,88 руб., у 1836 г. – 28,57 руб., разам 281,7475 руб. [32, арк. 6]. Акрамя таго, прадстаўнікі высакароднага саслоўя прапанавалі выкарыстаць суму ў 200 тыс. руб. асігнацыямі, выручаную за праданы маёнтак нябожчыка генерал-маёра Рыгора Хорвата, якая ім была адлічана на богаўгодныя справы і з 1815 г. захоўвалася ў Магілёўскім прыказе грамадскай апекі. Такім чынам, у дадатак да 3-гадавога 8-капеечнага збору на ўтрыманне Полацкага кадэцкага корпуса меркавалі выкарыстаць даходы з паезуіцкіх уладанняў, маёнтка памерлага надворнага саветніка Шыпнеўскага, 200-тысячны капітал Р. Хорвата. Шэраг асоб пагадзіліся з абавязкам збору прыватных ахвяраванняў. Так, ганаровы наглядчык вучылішч Магілёўскай губерні Іван Цэханавецкі абвясціў аб намеры ўносіць на працягу 5 гадоў па 100 руб. кожны год з часу адкрыцця Полацкага кадэцкага корпуса, памешчык Іван Краеўскі з Клімавіцкага павета – 50 руб., Іосіф Васілеўскі з Аршанскага павета – 500 руб., Станіслаў Цэханавецкі з Чавускага павета – па 10 кап. з кожнай акладной душы мужчынскага полу свайго маёнтка (разам 99 руб.), Стэфан Дзерналовіч з Рагачоўскага павета – 100 руб., Ягмін з таго ж павета – па 10 кап. з кожнай рэвізскай душы мужчынскага полу (разам 35 руб.), Антоні Жукоўскі – па 25 кап. [29, арк. 2, 113–114, 131–132]. У цэлым, на карысць Полацкага

кадэцкага корпуса павінна было паступіць за кошт падушных збораў у першы год з Віцебскай губерні 10 514,77 руб. (за 3 гады – 28 355,53 руб.), з Магілёўскай – 5266,08 руб. [29, арк. 112, 118; 3, арк. 7, 43].

Грашовыя ахвяраванні, сабраныя дваранствам Віцебскай губерні для арганізацыі Полацкага кадэцкага корпуса, паступалі ў Віцебскі прыказ грамадскай апекі, у якім штогодныя сумы назбіранага капіталу прырасталі працэнтамі (табліца 3).

Табліца 3. – Рух мэтавай капітальнай сумы, ахвяраванай дваранствам Віцебскай губерні на ўладкаванне Полацкага кадэцкага корпуса, якая захоўвалася ў мясцовым прыказе грамадскай апекі

| Тэрмін | Руб. асігнацыямі | Руб. серабром |
|---|---|---|
| Да 1831 г. | 3942,31 | 0,52 |
| Да 1832 г. | 3942,31 | 0,52 |
| Да 1.09.1832 г. | 4456,58 | 16,64 |
| Да 1.09.1834 г. | 5803,7 | 17,3 |
| Да 1.09.1835 г. | 6035,84 | 17,99 |
| Да 1836 г. | 6277,28 | 18,7175 |
| Да 1837 г. | 6528,37 | 19,465 |
| Да 1838 г. | 6788,5 | 20,2 |
| Да 1839 г. | 7065,21 | 21 |

*Крыніца:* [8, арк. 63–63адв., 78, 79, 80, 85; 33, арк. 2, 10, 11, 13, 20; 34, арк. 2, 8].

Захоўваемы ў Віцебскім прыказе грамадскай апекі мэтавы "кадэцкі" капітал пастаянна прымнажаўся. Прыкладам, да 1836 г. у Віцебскім прыказе грамадскай апекі лічылася 6277,28 руб. асігнацыямі і 18,7175 руб. Серабром сумы, якая да 1837 г. за кошт прыросту 4% за 1836 г. (251,09 руб. асігнацыямі і 74,75 кап. серабром), склала ўжо капітал памерам у 6528,37 руб. асігнацыямі і 19,465 руб. серабром [35, арк. 1, 6, 7адв.]. Усяго ж з 1830 да 1839 г. мэтавы «кадэцкі» збор капіталу з працэнтамі ў Віцебскім прыказе грамадскай апекі павялічыўся ў 1,8 разы, з 3942,31 руб. асігнацыямі і 0,52 руб. серабром да 7065,21 руб. асігнацыямі і 21 руб. серабром (гл. табліцу 3).

Дваранствам Смаленскай губерні, акрамя ахвяраванай да 1829 г. сумы ў 17 305 руб. для заснавання кадэцкага корпуса ў Полацку, быў вызначаны памер штогадавога мэтавага збору з яе, які склаў 2597,94 руб. [32, арк. 9адв.; 29, арк. 127].

У Полацкі кадэцкі корпус спачатку планавалі набіраць дваранскіх дзяцей з прыпісаных у яго ведамства Віцебскай, Магілёўскай, Смаленскай (дваране Смаленскай губерні былі прылічаны да Полацкага кадэцкага корпуса замест мяркуемага да заснавання Смаленскага) [36, арк. 15, 19], Мінскай, Гродзенскай, Віленскай губерняў і Беластоцкай вобласці. Акрамя малалетніх стыпендыятаў з ліку прыпісаных 6 губерняў, у Полацкі кадэцкі корпус маглі паступаць дзеці дваран з ліку генералаў, штаб- і обер-афіцэраў ваеннага пасялення ў Віцебскай і Магілёўскай губернях [37, с. 59–60, 107]. Аднак, паколькі з Віленскай губерні і Беластоцкай акругі не паступіла ніякіх грашовых сродкаў, яны былі выключаны з роспісу. Колькасць прысылаемых у Полацк кандыдатаў з кожнай з прыпісаных губерняў, якія мелі права на залічэнне ў Полацкі кадэцкі корпус, абумоўлівалася наяўнасцю адпаведных 4% з мінімальнай капітальнай сумы памерам у 16 150 руб. асігнацыямі, з разліку па 644,56 руб. асігнацыямі на кожнага выхаванца.

У цэлым, у адпаведнасці з загадам па ваенна-вучэбным установам ад 2.05.1835 г., дваранства 5 заходніх губерняў сабрала прыкладна да 155 тыс. руб. асігнацыямі капіталу, які належаў ведамству Полацкага кадэцкага корпуса (табліца 4).

Табліца 4. – Колькасць грашовых сродкаў, унесеных да мая 1835 г. дваранствам 5 губерняў у фонд мяркуемага да адкрыцця Полацкага кадэцкага корпуса

| Губерня | Капіталы, руб. асігнацыямі | Належныя з грашовай сумы штогадавыя 4 %, руб. асігнацыямі | Колькасць мяркуемых выхаванцаў адпаведна працэнтнай сумы, чал. |
|---|---|---|---|
| Мінская | 100620,535 | 4024,8 | 6 |
| Смаленская | 22493,5925 | 399,72 | 1 |
| Гродзенская | 17496,13 | 699,84 | 1 |
| Магілёўская | 8339,68 | 333,56 | 0 |
| Віцебская | 5868,575 | 234,72 | 0 |
| Разам | 154818,5125 | 6192,64 | 8 |

*Крыніца:* [1, с. 5].

**Заключэнне.** Такім чынам, фінансавымі крыніцамі ўладкавання будынкаў Полацкага кадэцкага корпуса, адкрываемага для падрыхтоўкі да вайсковай службы дваранскіх малалетніх хлопчыкаў з навакольных губерняў, сталі як вылучаныя ўрадам казённыя грашовыя сродкі, так і сумы прыватных дваранскіх ахвяраванняў з 1829 г. за кошт мэтавага падушнага збору з уласных сялян. У асноўным выдаткаваныя фінансавыя рэсурсы пайшлі на пераабсталяванне памяшканняў прызначаных у ведамства Полацкага кадэцкага корпуса казённых будынкаў. Будаўнічыя задачы дыктаваліся архітэктурнымі ўмовамі існуючых памяшканняў, але ў выніку перабудовы будынкаў цалкам не ўдалося пераадолець зразумелыя цяжкасці, звязаныя з прыдатным размяшчэннем службовага

персаналу і кадэтаў. Хоць у ходзе будаўнічых работ 1830–1834 гг. і было сэканомлена больш 7% каштарыснай сумы, былі адзначаны шматлікія недахопы і дэфекты ў перабудаваных кадэцкіх будынках. Усе грашовыя разлікі Полацкай будаўнічай камісіі былі канчаткова здзейснены да лета 1837 г., хоць вылучэнне грошай для перабудовы і рамонту будынкаў праваслаўнага кафедральнага сабора пры Полацкім кадэцкім корпусе працягвалася да 1839 г.

ЛІТАРАТУРА

1. Викентьев В.П. Полоцкий кадетский корпус: исторический очерк 75-летия его существования 1835–1910. – Полоцк: Тип. Х.В. Клячко, 1910. – [6], 396, XLIII с., [7] л. ил., портр.
2. Арлоў У.А. Таямніцы полацкай гісторыі. – Мінск: «Папуры», 2008. – 608 с., іл.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 4887.
4. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 9106.
5. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 8448.
6. НГАБ. – Ф. 2613. Воп. 1. Спр. 1.
7. НГАБ. – Ф. 3157. Воп. 1. Спр. 93.
8. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 2075.
9. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 4567.
10. НГАБ. – Ф. 2640. Воп. 1. Спр. 52.
11. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 9111.
12. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 4889.
13. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 5241.
14. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 9131.
15. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. Спр. 7459.
16. НГАБ. – Ф. 1416. Воп. 4. Спр. 3051.
17. Соловьев А.А. Полоцкий иезуитский коллегиум в ретроспективе (1581–1914): архитектурно-археологический очерк. – Полоцк: Полоцкое книжное издательство, 2012. – 98 с., XII с. цв. ил.
18. НГАБ. – Ф. 1416. Воп. 5. Спр. 2451.
19. НГАБ. – Ф. 2613. Воп. 1. Спр. 2.
20. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 4890.
21. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 5966.
22. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 4913.
23. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 7884.
24. Из писем Я. И. Ростовцова к великому князю Михаилу Павловичу // Педагогический сборник. – 1885. – № 3. – С. 223–244.
25. НГАБ. – Ф. 2613. Воп. 1. Спр. 4.
26. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 5327.
27. Высочайше утверждённое 1.02.1830 г. предположение о губернских кадетских корпусах, опубликованное Сенатом 10.03.1830 г. // Полное собрание законов Российской империи : собрание 2-е с 1825 по 1881 г. : в 55 т. – СПб.: Тип. 2-го отд. собств. е. и. в. канцелярии, 1830–1884. –Т. 5–1. – № 3457. – 1831. – С. 107–109.
28. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1959.
29. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 4529.
30. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 5584.
31. НГАБ. – Ф. 2638. Воп. 1. Спр. 414.
32. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 22774.
33. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3707.
34. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 7244.
35. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 5863.
36. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 5748.
37. Мельницкий Н.Н. Сборник сведений о военно-учебных заведениях в России (сухопутного ведомства): в 4 т. – СПб.: Тип. Гл. Штаба е.и.в. по военно-учебным заведениям, 1857–1860. – Т. 2., Ч. 3. – 1857. – 222 с.

*Пастyпiў 18.10.2022*

## ПОДГОТОВИТЕЛЬНЫЕ МЕРОПРИЯТИЯ К ОТКРЫТИЮ ПОЛОЦКОГО КАДЕТСКОГО КОРПУСА: ОРГАНИЗАЦИОННО-ФИНАНСОВЫЕ АСПЕКТЫ

***А.В. ЕРОШЕВИЧ***
***(Белорусский государственный экономический университет, Минск)***

*Статья затрагивает организационно-финансовые аспекты, связанные с совокупностью подготовительных мероприятий российских властей по созданию Полоцкого кадетского корпуса в 1830–1835 гг. Выясняются причины создания сети губернских кадетских корпусов в императорской России, условия открытия кадетского корпуса в Полоцке – среднего военно-образовательного учреждения закрытого типа в поветовом центре Витебской губернии. Раскрывается процесс создания строительной комиссии, её персональный состав, финансирование. Уделяется внимание поиску и выбару зданий для размещения Полоцкого кадетского корпуса, подготовительным*

*мероприятиям по обустройству кадетских помещений. Определяются количественные показатели ассигнований денежных средств на перестройку поиезуитских строений. Характеризуется состояние перестроеных кадетских корпусов и иные дополнительные работы по приспособлении культового здания до 1839 г. Приводятся данные о денежных расчетах с подрядчиками и информация о вознаграждении членов Комиссии. Показывается механизм сбора финансовых средств для основания кадетского корпуса в Полоцке, выявляются его количественные показатели до 1839 г. Большинство сведений, выявленых автором в фондах Национального исторического архива Беларуси и приведенных в статье, используются впервые в национальной историографии.*

***Ключевые слова:*** *Полоцк, кадетские корпуса, подготовка, мероприятия, строительство, денежные фонды, финансирование.*

## PREPARATORY MEASURES FOR THE OPENING OF THE POLOTSK CADET CORPS: ORGANIZATIONAL AND FINANCIAL ASPECTS

***A. YERASHEVICH***
***(Belarusian State Economic University, Minsk)***

*This article touches on the organizational and financial aspects of the set of preparatory measures undertaken by the Russian authorities during the creation of the Polotsk Cadet Corps in 1830–1835. The reasons for the creation of a network of provincial cadet corps in Imperial Russia, the prerequisites for the opening of a cadet corps in Polotsk – a closed-type secondary military educational institution in the district center of Vitebsk province – are investigated. The process of creating a construction commission, recruiting its personnel, and raising finances is revealed. Special attention is paid to the search and selection of buildings for the accommodation of the Polotsk Cadet corps and the preparatory measures for the arrangement of cadet buildings. Quantitative indicators of the allocation of funds for the reconstruction of Paezut buildings are determined. The condition of the rebuilt cadet buildings and other additional works on the adaptation of the cult building up to 1839 are characterized. Data on the monetary settlements with contractors and information on the remuneration of commission members are provided. The mechanism of collecting funds for the foundation of the cadet corps in Polotsk is indicated, their quantitative results until 1839 are revealed. Most of the information extracted by the author from the funds of the National Historical Archive of Belarus and given in the article is used for the first time in the national historiography.*

***Keywords:*** *Polotsk; cadet corps; preparation; events; construction; monetary funds; financing.*